УДК 316.77;070

***С.В. Венідзіктаў***
*канд. філал. навук, дац., нач. каф. сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь*
e-mail: tv.lab.mogilev@gmail.com

# ІНТЭГРАЦЫЙНЫ РЭСУРС АРАБСКАГА ТЭЛЕБАЧАННЯ ЯК СУБ'ЕКТА ПАЛІТЫЧНАЙ КАМУНІКАЦЫІ

*Даследуецца дзейнасць арабскіх тэлевізійных кампаній з пункту гледжання іх уплыву на сацыяльна-палітычныя працэсы і ролі ў сусветнай камунікацыйнай прасторы. Аналізуюцца прычыны ўзнікнення «феномену Al Jazeera», дзейнасць кампаній Al Manar, Al Resalah, Abu Dhabi Media, Al Alam News Network. Асэнсоўваецца ўплыў на функцыянаванне інфармацыйнага поля заходніх медыя: BBC Arabic television, Arab News Network, Sky News Arabia, France 24, RT Arabic, Al Hurra. Сцвярджаецца, што дзейнасць гэтых медыяструктур прыводзіць да неадназначных наступстваў: з аднаго боку, адбываецца згуртаванне аўдыторыі, у медыясферы ствараецца вобраз мусульманскай цывілізацыі, які выходзіць за межы яго нацыянальных складнікаў; з іншага боку, асобныя медыя арыентуюцца на абвастрэнне міжнацыянальных супярэчнасцей, правакуюць рост канфліктнасці, што спрыяе актывізацыі дэзінтэграцыйных працэсаў.*

**Уводзіны**

Тэндэнцыі медыйнага развіцця арабскіх дзяржаў дазваляюць перагледзець аргументы ў дыскусіі аб усталяванні новага сусветнага інфармацыйна-камунікацыйнага парадку, дзе дамінуюць заходнееўрапейскія і амерыканскія кампаніі. Ранейшы падзел сфер інфармацыйнага ўплыву па напрамках «Поўнач – Поўдзень» і «Захад – Усход» з відавочным адставаннем азіяцкага вектару больш не выглядае безапеляцыйным. З перанясеннем сусветнага эканамічнага цэнтру ў бок Азіі пачаўся і працэс глабальнага пераразмеркавання інфармацыйных плыняў. Напрыклад, у пачатку XXI ст. узрасло значэнне ў сусветнай камунікацыйнай прасторы кампаніі Al Jazeera, якая ператварылася ў эксклюзіўнага пастаўшчыка навін для ўплывовых медыяструктур глабальнага фармату. Гэта дапамагло ўключыць у сусветны парадак дня пытанні і праблемы рэгіёну, якія раней неадэкватна адлюстроўваліся ў медыяпрасторы. А працэсы эканамічнай інтэграцыі арабскіх дзяржаў заканамерна запатрабавалі адэкватнага медыйнага суправаджэння, стварэння камунікацыйнай асновы для супрацоўніцтва. «Лічбавы раскол» паміж Захадам і астатнім светам, пра які загаварылі на мяжы XX–XXI стагоддзяў, зараз у значнай ступені пераадолены. Вырашэнне праблемы тэхналагічнага і камунікацыйнага адставання дазволіла звярнуцца да пытанняў пабудовы новай інфраструктуры камунікатыўнага ўзаемадзеяння ў макрарэгіёне.

Інстытут СМІ ў перыяд сацыяльна-палітычнай трансфармацыі арабскіх дзяржаў і інтэграцыі іх інфармацыйных сістэм замяняе цэнтралізаваную сістэму палітычнай камунікацыі, спрыяючы фарміраванню палітычнай культуры аўдыторыі: «Адбываецца поўнае перапляценне сферы палітычнага і СМІ, што дазваляе казаць аб медыятызацыі палітыкі і фарміраванні медыяпалітычнай сістэмы» [1, с. 87] (тут і далей пераклад наш. – *С. В.*). СМІ ў палітычным працэсе ператварыліся ў «актыўна зацікаўлены фактар» [2], у сувязі з чым наяўнасць пастаяннага палітычнага фону ў камунікатыўным працэсе мы лічым адным з вырашальных фактараў палітычнай інтэграцыі. «Арабская вясна» і выкліканыя ёй сацыяльна-палітычныя працэсы паказалі, наколькі вялікі патэнцыял інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у дэманстрацыі, арганізацыі, кіраванні і стымуляванні розных форм грамадзянскай актыўнасці. У гэтым рэгіёне інфармацыйны канал сацыяльна-палітычнай інтэграцыі паказаў сваю эфектыўнасць, а насельніцтва прадэманстравала гатоўнасць у рэальных практыках рэагаваць на медыйныя паведамленні. У камунікатыўнай прасторы арабскага свету ўзрос уплыў сродкаў масавай інфармацыі традыцыйнага фармату, у першую чаргу тэлевізійнага вяшчання. У фокусе

сучасных даследаванняў найчасцей аказваецца тэлекампанія Al Jazeera, аднак аналіз толькі яе дзейнасці не дазваляе ацаніць рэсурс арабскага тэлебачання як суб’екта палітычнай камунікацыі, што выклікае неабходнасць паглыбленага аналізу працэсаў у медыясферы рэгіёну.

**Медыйнае ўзаемадзеянне ў працэсе сацыяльна-палітычнай інтэграцыі арабскіх дзяржаў**

У арабскім рэгіёне тэлевяшчанне стваралася ва ўмовах паскоранага развіцця. Толькі ў 1950-х гг. з’явіліся першыя тэлестудыі ў Саудаўскай Аравіі, Іраку і Ліване. Напрыклад, масавыя тэлетрансляцыі на арабскай і англійскай мовах у Саудаўскай Аравіі пачаліся ў 1965 г., да гэтага вяшчанне было абмежавана тэрыторыяй нафтавых промыслаў, дзе працавалі амерыканскія спецыялісты. Першапачаткова тэлекампаніі ў рэгіёне былі выключна дзяржаўнай формы ўласнасці – толькі ў Ліване развіваўся прыватны сектар, што адлюстроўвала імкненне кіраўніцтва краіны да развіцця канкурэнцыі і павышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальных СМІ на міжнародным узроўні.

Перыяд аўтаномнага развіцця медыйных сістэм арабскіх дзяржаў завяршыўся ў 1969 г., калі быў заснаваны Вяшчальны саюз арабскіх дзяржаў (ASBU). ASBU аказвае тэхнічную падтрымку, удзельнічае ў абмене навінамі, праграмаванні, арганізуе адукацыйныя праекты, садзейнічае выгаднаму набыццю вяшчальных правоў арганізацыямі-ўдзельнікамі. ASBU з’яўляецца актыўным членам Сусветнага саюза вяшчальнікаў (WBU), арыентуючыся на «ўмацаванне сувязей і садзейнічанне супрацоўніцтву паміж вяшчальнікамі ў арабскіх дзяржавах для паляпшэння якасці медыяпрадукцыі» [3].

У 2009 г. ASBU афіцыйна запусціў Мультымедыйную спадарожнікавую сетку абмену (MENOS), якая дазволіла аптымізаваць сістэму функцыянавання інфармацыйных рэсурсаў. У 1976 г. па рашэнні Лігі арабскіх дзяржаў была створана Арабская арганізацыя спадарожнікавай сувязі (Arabsat). Нягледзячы на шэраг палітычных супярэчнасцей паміж арабскімі дзяржавамі, якія адбіваюцца на фінансаванні і арганізацыйным узаемадзеянні, Arabsat і цяпер застаецца найбольш уплывовай структурай, аб’ядноўваючы больш за 20 дзяржаў. А сам вопыт міждзяржаўнага тэхналагічнага ўзаемадзеяння ў медыясферы з’яўляецца надзвычай карысным з пункту гледжання інфармацыйнай інтэграцыі арабскага свету.

Менавіта з’яўленне спадарожнікавага тэлебачання, на наш погляд, стала ключавым фактарам развіцця ў рэгіёне сучаснай журналістыкі. Плюралізм і патрэба ў канкурэнцыі (як унутры рэгіёну, так і ў міжнароднай прасторы) прымусілі СМІ адмовіцца ад архаічнага фармату пратакольнай фіксацыі навін з дзяржаўных структур, непазбежным стаў рост прафесіяналізму медыя. Колькасць спадарожнікавых каналаў, якія вяшчаюць на арабскай мове, імкліва расце і складае ўжо каля 400, што з’яўляецца важным кампанентам камунікатыўнай інтэграцыі. Большая частка медыя прадстаўлена дзяржаўнымі структурамі: нацыянальныя ўрады выкарыстоўваюць СМІ як інструменты палітычнага ўплыву.

Катарскі кампанія Al Jazeera са штаб-кватэрай у Досе, вяшчае з 1996 г. Пасля таго, як у 1997 г. кампанія атрымала доступ да рэсурсаў спадарожніка Arabsat, яе праграмы сталі даступнымі ў 22 краінах рэгіёну [4]. Канал быў першым сярод буйных СМІ, якія рызыкнулі адкрыць прадстаўніцтва ў Кабуле (1999 г.). Сусветнае значэнне тэлеканал набыў з пачаткам антытэрарыстычнай аперацыі ЗША ў Афганістане 2001 г.: Al Jazeera стаў для сусветнай грамадскасці эксклюзіўным пастаўшчыком медыяпрадукту з тэрыторыі, якую кантралявалі талібы, наладзіў кантакт з «тэрарыстам нумар адзін» бен Ладэнам. У кастрычніку 2001 г. Al Jazeera адзіным сярод сусветных СМІ трансліраваў у прамым эфіры авіяатаку на Кабул. Не абмінуў увагай канал і палестына-ізраільскі канфлікт: «[Al Jazeera] падрабязна адлюстроўваў арабскую інтыфаду на акупіраваных палестынскіх тэрыторыях Заходняга берагу ракі Іардан і ў сектары Газа, але пры гэтым надаваў увагу ходу ізраільскай перадвыбарчай кампаніі» [5, с. 203].

У сусветнай інфармацыйнай прасторы канал хутка набыў рэпутацыю прафесійнага і надзейнага медыя, з меркаваннем якога лічацца палітыкі і СМІ ўзроўню BBC і CNN. Аўдыторыя Арабскага Усходу са з'яўленнем Al Jazeera атрымала магчымасць усвядоміць уласную суб'ектнасць у інфармацыйнай прасторы, голас краін «трэцяга свету» ў эфіры загучаў побач з голасам Захаду. Al Jazeera змагла зацікавіць вядучыя медыя свету новым падыходам да адлюстравання падзей на Блізкім Усходзе (парушэннем негалоснай забароны на крытыку палітычных рэжымаў арабскіх краін). У 2006 г. было пачата вяшчанне на англійскай мове, што дазволіла значна павялічыць аўдыторыю (у тым ліку за кошт жыхароў неарабскіх мусульманскіх краін). Тым не менш неадназначнымі былі і агульная ацэнка значэння кампаніі для сусветнай інфармацыйнай прасторы, і трактоўка пазіцыі тэлеканала па ключавых палітычных пытаннях, і аналіз яго ўплыву на грамадскую думку.

Зараз, акрамя арабскага, у склад кампаніі ўваходзяць Al Jazeera English, Al Jazeera Documentary Channel, Al Jazeera Sports, Al Jazeera Mubasher (палітычны канал), Al Jazeera Turk (турэцкая версія канала), Al Jazeera Kiswahili (усходнеафрыканская версія на мове суахілі) і іншыя тэлеканалы. Склад журналістаў тут шматнацыянальны і шматканфесійны, што дазваляе зніжаць узровень канфліктнасці ў аналізе вострых палітычных і рэлігійных пытанняў: «Маштабнасць "Аль-Джазіры" дазваляе выступаць не толькі кансалідатарам арабскай дыяспары і... "аўтахтонных" аўдыторый, але і валодае велізарным патэнцыялам пашырэння… панарабізму на новыя тэрыторыі» [6, с. 76].

Імкненне Al Jazeera да незалежнай трактоўкі падзей у Афганістане і Іраку ў пачатку XXI ст. выклікала незадаволенасць ЗША. У красавіку 2004 г. рэзананс атрымала размешчаная ў СМІ інфармацыя аб тым, што прэзідэнт ЗША Джордж Буш і брытанскі прэм'ер Тоні Блэр падчас сустрэчы ў Белым доме абмяркоўвалі магчымасць авіяўдару па штаб-кватэры Al Jazeera [7]. Пасля падзей «Арабскай вясны» 2010–2011 гг. стаўленне амерыканскага ўраду да Al Jazeera змянілася на катэгарычна станоўчае: «мяккая сіла» медыйнага ўплыву на грамадска-палітычныя працэсы спрацавала ў адпаведнасці з палітычнымі прыярытэтамі ЗША. Рэпартажы Al Jazeera, прысвечаныя падзеям «Арабскай вясны», мелі характар прадуманай PR-кампаніі, накіраванай на сацыяльна-палітычную дэстабілізацыю. Характар адлюстравання падзей у пратэстуючых рэгіёнах узмацняў эфект Facebook-рэвалюцый, прыводзіў да змены рэжымаў і паслаблення палітычных канкурэнтаў Катара. Масавыя хваляванні і наступная грамадзянская вайна ў Лівіі, паказаныя ў рэпартажах Al Jazeera, таксама прывялі да фарміравання ў аўдыторыі скажоных уяўленняў: «Сумесна з заходнімі тэлеканаламі "Аль-Джазіра" спрыяла стварэнню міфу аб "Арабскай вясне" як дэмакратычнай рэвалюцыі супраць тыраніі ў рэгіёне» [5, с. 206].

Нельга не адзначыць і адваротны бок падобных працэсаў, які сведчыць аб велізарным камунікатыўным рэсурсе Al Jazeera: тая ступень уплыву на грамадскія настроі, здольнасць кіраваць палітычнымі арыентацыямі насельніцтва, якую прадэманстравалі арабскія медыя, відавочна, з'яўляецца недасягальнай у прасторы еўрапейскай інтэграцыі. У гэтым праяўляецца і цывілізацыйная спецыфіка рэгіёну, і адсутнасць устойлівых традыцый да міждзяржаўнай палітычнай інтэграцыі, і высокі ўзровень канфліктнасці грамадскай сферы ў цэлым. Геапалітычная абстаноўка ў арабскім свеце на мяжы XX–XXI стагоддзяў складвалася такім чынам, што ўзнікла аб'ектыўная патрэба ў стварэнні камунікатыўнай прасторы, якая змагла б адлюстраваць новую грамадскую рэальнасць. Рэцэпцыя прапануемай Al Jazeera інфармацыі і наступная на яе рэакцыя з'яўляюцца відавочнымі сведчаннямі камунікатыўнай інтэграцыі Блізкага Усходу: «"Аль-Джазіра", пры ўсіх агаворках, адыграла ролю ў стварэнні і фарміраванні панарабскай грамадскай думкі, аўдыторыя ў розных краінах знайшла агульныя падыходы, выявіла агульныя праблемы, змагла асэнсаваць шляхі іх вырашэння. Гэтыя дасягненні ўяўляюцца кансалідуючым эфектам дзейнасці канала» [6, с. 79].

Al Jazeera працягвае функцыянаваць ва ўмовах канкурэнцыі з іншымі арабскімі тэлесеткамі. З 2003 г. ажыццяўляе вяшчанне канал Al Arabiya («умераная альтэрнатыва Al Jazeera»), арганізаваны ў Дубаі. Існуе меркаванне, што члены каралеўскай сям'і саудзітаў стварылі гэты рэсурс, грунтуючыся на прынцыпах, цалкам процілеглых палітыцы Al Jazeera – у падтрымку «ўмераным» арабскім рэжымам. З улікам рэгулярнай крытыкі саудзітаў з боку Al Jazeera, а таксама сімпатый радыкальным групоўкам, Al Arabiya развіваецца ў канкурэнтным асяроддзі. Інфармацыйнае вяшчанне Al Arabiya ўключае ў сябе палітычныя, фінансава-эканамічныя, культурныя, спартыўныя праекты і інш. З 2004 г. працуе інтэрнэт-партал Al Arabiya, дзе размяшчаюцца матэрыялы на арабскай, англійскай мовах, фарсі і урду (з 2008 г.). У праграмных дакументах канала паказана, што ён «створаны для задавальнення патрэбы арабскай аўдыторыі ў надзейнай, актуальнай… інфармацыі» [цыт. па: 8, с. 155]. Нягледзячы на гэта, у 2004 і 2006 гг. канал часова забараняўся ў Іране, а ў 2017 г. брытанская арганізацыя OFCOM выкарыстала цэнзуру, каб не дапусціць распаўсюджвання інтэрв'ю з ахвярай катаванняў у Бахрэйне.

З 2000 г. існуе ліванскі канал Al Manar, які характарызуецца радыкальнымі шыіцкімі памкненнямі. Пры гэтым назіраюцца адрозненні ў падачы інфармацыі на мясцовым (для Лівана) і на міжнародным узроўнях: у панарабскім фармаце канал фармальна прытрымліваецца нейтралітэту ў адлюстраванні палітычных і рэлігійных пытанняў. Аднак у шэрагу еўрапейскіх краін Al Manar заблакіраваны пасля абвінавачванняў у антысіяніцкай, антыізраільскай і антыамерыканскай прапагандзе, у сувязях з партыяй «Хезбала» (у эфіры гучаць заклікі ахвяраваць ёй грошы). У ЗША канал абвешчаны тэрарыстычным. Падчас Ліванскай вайны 2006 г. офіс кампаніі ў Бейруце ў абыход нормам міжнароднага права атакавалі ваенна-паветраныя сілы Ізраіля (асацыяцыя журналістаў Ізраіля ў адказ на крытыку заявіла, што на Al Manar працуюць не журналісты, а тэрарысты). Такім чынам, аб'ектыўнасць і неангажаванасць як характарыстыкі інфармацыйнага вяшчання ў палітыцы Al Manar адсутнічаюць: «Мы паказваем толькі ахвяр, а не агрэсара… Al Jazeera нейтральная, а Al Manar стаіць на баку Палестыны» [9].

Ісламскі спадарожнікавы канал Al Resalah («Пасланне») з офісам у Каіры працуе з 2006 г., пакрываючы вяшчаннем Блізкі Усход, Паўночную Афрыку і частку Еўропы. Асноўнай мэтай канала з'яўляецца кансалідацыя мусульманскага грамадства, стварэнне платформы для дыялогу па розных пытаннях сацыяльна-палітычнагага, рэлігійнага, эканамічнага жыцця. Першапачаткова Al Resalah арыентаваўся на маладзёвую частку арабскай аўдыторыі, затым пашырыў уплыў за кошт англамоўнага вяшчання, імкнучыся не дапусціць распаўсюджвання экстрэмісцкай ідэалогіі і скажэння сутнасці ісламу.

У 1998 г. пачаў вяшчанне канал Iqraa, мэтавай аўдыторыяй якога з'яўляюцца прадстаўнікі мусульманскіх абшчын краін Еўропы, Аўстраліі і Паўночнай Амерыкі: «Імкненне захаваць сваю мову і культуру з'яўляецца моцным стымулам для арабаў-мусульман, якія эмігрыравалі ў Заходнюю Еўропу, каб развіваць сістэму нацыянальных СМІ за мяжой. З той жа прычыны арабскія дзяржавы культывуюць свае міжнародныя (панарабскія) медыя» [8, с. 22]. Праз асветніцкія праекты і тлумачэнне палажэнняў ісламу канал імкнецца спрыяць інтэграцыі мусульман у супольнасці заходняга тыпу, пашырэнню талерантнасці.

У 2007 г. у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах пачала дзейнічаць медыйная арганізацыя ўраду Абу-Дабі – Abu Dhabi Media (ADM), якая ўключае 18 падраздзяленняў у тэлекамунікацыйнай, друкаванай і інтэрнэт-галінах. Нягледзячы на фінансавую падтрымку з боку дзяржавы, ADM карыстаецца досыць шырокай рэдакцыйнай і арганізацыйнай свабодай. ADM арыентуецца як на задавальненне ўнутраных інфармацыйных патрэб Эміратаў, так і на дасягненне камерцыйнага эфекту, падтрымліваючы партнёрскія адносіны з замежнымі структурамі. Уплывовы тэлеканал Abu Dhabi TV, які ўваходзіць у склад ADM, набыў папулярнасць у 2003 г. праз адлюстраванне на Захадзе ваеннай кампаніі ў Іраку. Зараз канал даступны гледачам у Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы, Еўропе, Аўстраліі.

Дзяржаўная медыякарпарацыя Ірана IRIB кантралюе сеткавы канал навін Al Alam News Network (AANN), заснаваны ў 2003 г. Сусветная аўдыторыя канала дасягае 300 млн, найбольшая колькасць гледачоў засяроджана ў дзяржавах Персідскага заліву і Міжземнаморскага рэгіёну, спадарожнікавае вяшчанне даступна на пяці кантынентах. У кантэксце напружанасці ў сусветнай і рэгіянальнай геапалітычнай прасторы, а таксама росту ўплыву арабскіх медыя на палітычныя працэсы, роля AANN у захаванні ўстойлівасці інфармацыйнай прасторы рэгіёну ўяўляе асаблівую цікавасць. Напрыклад, AANN адлюстроўваў ваенную аперацыю ЗША ў Іраку, фарміруючы стаўленне да яе, у першую чаргу, саміх грамадзян Ірака. У 2006 г. канал паказваў падзеі 33-дзённай вайны паміж Ізраілем і Ліванам, у 2008–2009 гг. – ваенны канфлікт у сектары Газа, сцвярджаючы афіцыйную пазіцыю Ірана.

**Заходні вектар інфармацыйнага ўплыву**

Варта звярнуць увагу і на ролю ў сацыяльна-палітычных працэсах рэгіёну еўрапейскіх і амерыканскіх тэлеканалаў на арабскай мове. Напрыклад, з 2008 г. функцыянуе брытанскі міжнародны грамадскі канал кругласутачнага вяшчання BBC Arabic television. Першы праект інфармацыйнага вяшчання BBC быў закрыты ў 1996 г. у выніку рознагалоссяў з кіраўніцтвам Саудаўскай Аравіі. Адноўлены канал адрасаваны у першую чаргу аўдыторыі краін Блізкага Усходу; ён даступны ў Паўночнай Афрыцы, краінах Персідскага заліву, дэкларуючы палітыку прафесійных і свабодных ад палітычнага ўціску навін. Пазіцыі BBC у арабскім сектары інфармацыйнай прасторы можна растлумачыць, у тым ліку, іміджавай палітыкай канала, якая дазволіла сфарміраваць у свядомасці міжнароднай аўдыторыі вобраз аб’ектыўнага і карэктнага СМІ. Паказальна, што скарачэнне брытанскім урадам у 2011 г. расходаў на фінансаванне BBC World Service не закранула арабскі канал – наадварот, яго бюджэт быў павялічаны. У гэтым бачыцца і прызнанне асаблівай ролі тэлебачання для брытанскай знешняй палітыкі, і жаданне захаваць інструмент інфармацыйнага ўплыву на блізкаўсходнюю палітыку.

Яшчэ да з’яўлення BBC Arabic з Лондана вялося вяшчанне тэлеканала Arab News Network (ANN, заснаваны ў 1997 г.), які пазіцыянуецца як дэмакратычны інфармацыйны рэсурс. У 2004–2006 гг. тэлеканал выпускаў штодзённыя навіны на англійскай мове, у 2006–2014 гг. вяшчанне вялося выключна на арабскай мове. Вынікам супрацоўніцтва брытанскай Sky News і карпарацыі Abu Dhabi Media Investment Corporation (ADMIC) стала з’яўленне ў 2012 г. гібрыднага араба-брытанскага канала Sky News Arabia, які вяшчае ў асноўным на тэрыторыі Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі. З канца 2006 г. ажыццяўляе трансляцыю на арабскай, французскай і англійскай мовах канал France 24, які складае сур’ёзную канкурэнцыю як Al Jazeera, так і BBC Arabic television. З 2010 г. France 24 перайшоў на кругласутачны фармат і прапануе аўдыторыі значны аб’ём інфармацыйна-аналітычных, інтэрактыўных праектаў, інтэрв’ю. У адрозненне ад амерыканскіх СМІ, якія робяць акцэнт на эканамічных складніках міждзяржаўнага супрацоўніцтва, France 24 значную ўвагу надае супрацоўніцтву ў сферы культуры [10, с. 100]. З 2007 г. функцыянуе расійскі тэлевізійны канал на арабскай мове – RT Arabic (першапачаткова называўся «Русія аль-Яўм» – «Расія сёння»), арыентаваны на шырокае адлюстраванне пытанняў палітыкі, эканомікі, культуры, спорту. У 2008–2009 гг. «Русія аль-Яўм» быў адзіным расійскім тэлеканалам, які рэагаваў на падзеі ў сектары Газа падчас араба-ізраільскага канфлікту. Раней, падчас ваенных дзеянняў 2008 г., канал рэгулярна рыхтаваў сюжэты з Тбілісі, Горы, Цхінвіла. Да 2014 г. аўдыторыя RT Arabic наблізілася да 10 млн, а сайт тэлеканала увайшоў у лік трох найлепшых інфармацыйных рэсурсаў у арабскім свеце [11].

Асобна варта згадаць аб амерыканскім праекце спадарожнікавага вяшчання на арабскай мове – канале Al Hurra («Свабодны»), які функцыянуе з 2004 г. у якасці альтэрнатывы Al Jazeera і Al Arabiya. Адной з асноўных задач канала было стварэнне станоўчага вобразу ЗША ў процівагу антыамерыканскай прапагандзе арабскіх СМІ.

Al Hurra не змог замацавацца сярод найбольш уплывовых панарабскіх СМІ, дзейнічаючы на аснове амерыканскіх прынцыпаў і тэхналогій у цывілізацыйным асяроддзі абсалютна іншага тыпу (напрыклад, шырока абмяркоўваўся выпадак звароту аднаго з тэлевядучых да мусульманскай аўдыторыі ў свята Вялікдня са словамі «Хрыстос уваскрос!»). Непрафесіяналізм рэдакцыі Al Hurra выяўляўся і ў адсутнасці выразнай інфармацыйнай стратэгіі, і ў ідэалагічнай нетрываласці: «“Свабодны”, апраўдваючы сваю назву, мог выпусціць у эфір выступленне лідэра шыіцкай і тэрарыстычнай арганізацыі “Хезбала” альбо матэрыял аб правядзенні канферэнцыі па абвяржэнні “міфу аб халакосце” ў Іране, удзельнікі якой прама заяўлялі пра “неабходнасць знішчэння Ізраіля як дзяржавы”» [12]. Адарванасць ад рэальнай аўдыторыі і немагчымасць канкурыраваць з іншымі панарабскімі СМІ ў плане вастрыні і актуальнасці вяшчання сталі прычынамі таго, што ў 2008 г. адміністрацыя ЗША спыніла фінансаванне праекту.

**Заключэнне**

Дзейнасць медыяструктур арабскага свету прыводзіць да неадназначных наступстваў. З аднаго боку, каналы, падобныя Al Jazeera, садзейнічаюць згуртаванню аўдыторыі рэгіёну, ствараючы ў медыясферы вобраз мусульманскай цывілізацыі, які выходзіць за межы асобных нацыянальных яго складнікаў: «Панарабскія і панісламскія СМІ робяць значныя намаганні для таго, каб стварыць станоўчы вобраз ісламу і арабскай культуры ў цэлым у вачах заходняй супольнасці і станоўча ўплываць на этнаканфесійныя адносіны ва ўсім свеце» [8, с. 157]. Міжнароднае вяшчанне арабскага тэлебачання таксама спрыяе захаванню культурнай ідэнтычнасці дыяспар. З іншага боку, тэлеканал Al Manar і падобныя яму медыяструктуры арыентуюцца на абвастрэнне міжнацыянальных супярэчнасцей, стымуляванне росту канфліктнасці, адкрытага ваеннага супрацьстаяння, што актывізуе зваротную, дэзінтэграцыйную тэндэнцыю [13]. Можна сцвярджаць, што працэсы ў медыясферы дадзенага рэгіёну з’яўляюцца адлюстраваннем агульнай сацыяльна-палітычнай і рэлігійнай сітуацыі ў арабскім свеце, імкліва рэагуючы на змены ў ёй.

Такім чынам, панарабскія СМІ, на наш погляд, уяўляюць цікавасць як аб’ект далейшага вывучэння з некалькіх пунктаў гледжання. Па-першае, з пазіцыі наладжвання ўзаемадзеяння розных медыйных сістэм, якія адрозніваюцца структурна-арганізацыйна, палітычна, ідэалагічна і аўдыторна. Да мяжы ХХ і XXI стагоддзяў нельга было весці гаворку пра існаванне адзінага інфармацыйнага поля (а тым больш – прасторы) арабскага свету, а цяпер яно ўспрымаецца як рэальнасць. Па-другое, з пункту гледжання пабудовы дэцэнтралізаванай, сеткавай сістэмы масавага інфармавання, у якой змест медыяпаведамленняў вызначаецца патрэбамі аўдыторыі і аб’ектыўным парадкам дня рэгіёну. Па-трэцяе, з пункту гледжання ўзаемадзеяння з іншымі, знешнімі медыйнымі сістэмамі, уваходу ў архітэктуру сусветнай інфармацыйнай прасторы. Буйныя вяшчальнікі арабскага рэгіёну не проста прапанавалі альтэрнатыву заходняму мэдыякантэнту – яны стварылі сваю ўнікальную інфармацыйную прастору. Іх медыйны прадукт удала дапаўняе заходні, ліквідуе прабелы ў апошнім, прапануе аўдыторыі альтэрнатыўны (хоць, трэба прызнаць, далёка не заўсёды аб’ектыўны) погляд на сацыяльна-палітычную рэальнасць. Нарэшце, вопыт арабскага тэлебачання ўяўляе цікавасць з пункту гледжання арганізацыі яго функцыянавання ва ўмовах знешняга інфармацыйнага procідзеяння, неабходнасці сцвярджэння ўласнай унікальнасці і самастойнага месца ў сусветнай медыяпрасторы.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Засурский, И. И. Масс-медиа второй республики / И. И. Засурский. – М. : МГУ, 1999. – 270 с.

2. McCombs, M. Setting the agenda : The mass media and public opinion / M. McCombs. – Cambridge : UK Polity Press, 2004. – 184 p.

3. Arab States Broadcasting Union [Electronic source] // WorldDAB : online global forum. – Mode of access: http://www.worlddab.org/membership/worlddmbmembers/781/arab-states-broadcasting-union. – Date of access: 24.02.2019.

4. Виниченко, В. М. Феномен «Аль-Джазиры» на ближневосточном и глобальном информационных рынках / В. М. Виниченко // Науч. ведомости Белгород. гос. ун-та. Сер.: Гуманитар. науки. – 2014. – № 13 (184). – С. 156–166.

5. Шафель, А. Эволюция состава новостных арабоязычных спутниковых телеканалов в начале XXI в. / А. Шафель, Х. Шаиф // Науч. ведомости Белгород. гос. ун-та. Сер.: Гуманитар. науки. – 2014. – № 6 (177). – С. 202–209.

6. Савельева, Е. А. Медиатексты «Аль-Джазиры»: факторы консолидации или конфронтации? / Е. А. Савельева, А. В. Чернов // Вестн. Череповец. гос. ун-та. – 2015. – № 5 (66). – С. 76–80.

7. Paper Says Bush Talked of Bombing Arab TV Network [Electronic source] // The Washington Post : official web-site. – Mode of access: http://www.washingtonpost.com/wp-dyn/content/article/2005/11/22/AR2005112201784.html?noredirect=on. – Date of access: 29.01.2019.

8. Пую, А. С. Современное арабское телевидение как посредник в диалоге культур / А. С. Пую, А. А. Садыхова // Россия и мусульманский мир. – 2013. – № 11 (257). – С. 153–157.

9. Goldberg, J. Are terrorists in Lebanon preparing for a larger war? [Electronic source] / J. Goldberg // The New Yorker. – 2002. – Oct. 14. – Mode of access: https://www.webcitation.org/5gbBkEx6J?url=http://www.jeffreygoldberg.net/articles/tny/a_reporter_at_large_in_the_par.php. – Date of access: 22.02.2019.

10. Федотова, Л. Н. Глобальные и национальные аспекты развития мировой информационной среды / Л. Н. Федотова // Вестн. Рос. ун-та дружбы народов. Сер.: Литературоведение, журналистика. – 2012. – № 4. – С. 98–107.

11. Сайт телеканала RT на арабском языке вошел в тройку лидеров в арабском мире [Электронный ресурс] // RT на русском : официальный сайт. – Режим доступа: https://russian.rt.com/article/2527. – Дата доступа: 05.03.2019.

12. Свободный от смысла: американский конкурент «Аль-Джазиры» не смог оправдать надежд Вашингтона [Электронный ресурс] // Взгляд : деловая газета : официальный сайт. – Режим доступа: https://vz.ru/politics/2008/6/23/180186.html. – Дата доступа: 05.03.2019.

13. Венидиктов, С. В. Медиакоммуникация в развитии евразийского пространства: стратегический ресурс интеграции : монография / С. В. Венидиктов. – Минск : БГУ, 2018. – 263 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 14.03.2019

***Venidziktau S.V.*** **Integration Resource of the Arab Television as the Political Communication Subject**

*The article examines the activities of television companies of the Arab countries in terms of their impact on the socio-political processes and the role in the global communication space. The author analyzes the causes of the «Al Jazeera phenomenon», the activities of companies Al Manar, Al Resalah, Abu Dhabi Media, Al Alam News Network, interpreted the impact on the information field functioning of the Western media – the BBC Arabic television, Arab News Network, Sky News Arabia, France 24, RT Arabic, Al Hurra. It is alleged that the activities of these media structures leads to dual consequences: on the one hand, there is unity of the audience, creates an image of the Muslim civilization in the media field, which goes beyond its national components; on the other hand, some media are guided by the exacerbation of ethnic conflicts, to promote the growth of conflicts that activates the disintegrative trends.*